Кожнае мастацтва ўпрыгожваюць таленты, якія валодаюць дарам непаўторнай адметнасці. Такім талентам была народная па званні і прызнанні артыстка Стэфанія Міхайлаўна Станюта. Доўга і высакародна служыла яна роднаму купалаўскаму тэатру, зведаўшы вялікую любоў і пашану многіх пакаленняў гледачоў, калег і сяброў.

Стэфанія Станюта – карэнная мінчанка, дачка вядомага мастака М.П. Станюты. Менавіта бацька першым заўважыў у дзяўчынкі талент пераўвасаблення. Ды і наогул юная Стэфанія была пластычная, з выдатным музычным слыхам, вельмі любіла танцаваць. Паводле слоў самой актрысы, “дзякуючы амаль што звар’яцеласці на гэтым сваім танцаванні я ў рэшце рэшт і аказалася ў трупе статыстаў Першага таварыства беларускай драмы і камедыі, якім кіраваў Фларыян Ждановіч, і якое неўзабаве было пераўтворана ў Першы Беларускі дзяржаўны тэатр”.

У 1921 г. у ліку здольнай моладзі Станюту накіравалі на вучобу ў Беларускую драматычную студыю, якая была арганізавана пры Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры (МХАТ). Пяць гадоў вучобы прайшлі ў суровай працы. Тады ж прыйшлі да пачынаючай артысткі і першыя ўдачы, якія прынеслі ёй ролі Тытаніі ў спектаклі “Сон у летнюю ноч”, Венеры ў народнай драме “Цар Максімільян”, Агавы ў “Вакханках” Эўрыпіда. Гэтымі спектаклямі адкрыўся ў Віцебску Другі Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-2), куды разам з выпускнікамі студыі ў 1926 г. трапіла і Станюта. Тут яна працавала пяць гадоў. За гэты час маладая артыстка сыграла палымяную, тэмпераментную Псіхею (“Эрос і Псіхея” Ю. Жулаўскага), жывую, аптымістычную, вясёлую Манюню (“Каля тэрасы” М.Грамыкі), жаноцкую, рамантычную і моцную духам партызанку Паліну (“Авангард” В. Катаева) і першыя камедыйныя ролі – Эміль (“Калі пяюць пеўні” Ю. Юр’іна) і Людмілу Міхайлаўну (“Рэйкі гудуць” У. Кіршона).

Калі Станюта ўступіла ў трупу БДТ-1 (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), яго сцэну ўпрыгожвалі імёны такіх выдатных майстроў, як У. Крыловіч, У. Уладамірскі, Г. Глебаў, Б. Платонаў, Ф. Ждановіч, В. Галіна, Л. Ржэцкая, В. Пола і інш. У гэтай акцёрскай сям’і Станюта заняла сваё адметнае месца. Яе палюбілі ў тэатры за яскравы талент, за вялікую чалавечую прыгажосць, за сціпласць і добрасумленныя адносіны да працы. Акцёрскі лёс Стэфаніі Міхайлаўны склаўся надзвычай удала, і за доўгае жыццё на купалаўскай сцэне яна стварыла цэлую галерэю жаночых вобразаў, сярод іх: Глафіра (“Ваўкі і авечкі” А. Астроўскага), Дуэнья (“Дзень цудоўных падманаў” Р. Шэрыдана), Дыяна (“Сабака на сене” Лопэ дэ Вегі). Нельга забыць яе Зіначку Зёлкіну з камедыі К. Крапівы “Хто смяецца апошнім”, Марылю з “Раскіданага гнязда” Я. Купалы, Бабулю са спектакля “Я, бабуля, Іліко і Іларыён” Н. Думбадзе і Г. Лордкіпанідзе. Зорным часам актрысы стала роля вытанчанай французскай арыстакраткі і дзівачкі ў спектаклі “Гаральд і Мод” К. Хігінса і Ж.К. Кар’ера. Яе Мод – увасабленне любові, прагі да жыцця; адчуванне хараства і асалоды ва ўсіх праявах. Смелая, абаяльная і інтэлігентная, яна нібы выпраменьвала энергію сонца, святла, цеплыні, прыгажосці і вольнасці; вучыла любіць жыццё, не баяцца старасці. Актрыса сцвярджала, што няма старасці там, дзе пануе маладосць сэрца і душы! Да ліку значных работ апошніх гадоў адносіцца роля Арыны Радзівонаўны (“Верачка” А. Макаёнка). У гэтым вобразе шмат цікавых, непаўторных фарбаў і нюансаў, запамінальных акцёрскіх дэталяў. Гэта роля выконвалася Станютай з асаблівай любоўю і натхненнем. У ёй актрыса здолела перадаць сапраўдную народнасць жаночага характару, яго духоўнасць і прыгажосць.

Імя Стэфаніі Станюты звязана не толькі са сцэнай купалаўскага тэатра. Асобнай старонкай яе творчасці з’яўляецца кіно. Актрыса знялася больш як у трыццаці кінафільмах, плённа супрацоўнічала з радыётэатрам і тэлебачаннем. У 2000 г. Стэфанія Міхайлаўна пайшла з жыцця. Глыбокі жаль ахоплівае, калі ўсведамляем, што яна больш не выйдзе на сцэну ці на

здымачную пляцоўку. І толькі знятыя са Станютай фільмы: “Белыя росы”, “Чужая бацькаўшчына”, “Мама, я жывы”, “Атланты і карыятыды”, “Тры карты”, “Развітанне” дапамогуць убачыць аблічча і постаць жанчыны, атрысы, чалавека-асобы.

* Цыт. па: Станюта А. Стэфанія. Мн., 1994. С. 17.